№ 12 (365)
Сакавік 2011 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

www.bfk.by

У нумары:

☞ Фэст экскурсаводаў: *Міжнароднаму дню помнікаў* – стар. 2

☞ Асоба ў краязнаўстве: *Аляксей Пяткевіч* – стар. 3

☞ *Краязнаўчая бібліятэка: летапіс Астрамечава* – стар. 6

Артыкул пра разбурэнне касцёла ў Новых Навасёлках Нясвіжскага раёна *гл. на стар. 3*

На тым тыдні...

✓ У Нацыянальным мастацкім музеі **14 сакавіка** адкрылася **выстаўка «Белае золата Херэнда – парцаляна для каралёў»**, дзе прадстаўленыя вырабы сусветна вядомай парцалянавай мануфактуры, заснаванай у 1826 годзе ў невялікай вёсачцы Херэнд у Венгрыі. Дзесяць гадоў таму дзейнасць прадпрыемства была прызнаная часткай венгерскай спадчыны. Дэманструюцца 36 вырабаў са збору пасольства Венгрыі ў Беларусі: дэкаратыўныя вазы, падсвечнікі, прадметы з чайнага, кававага і абедзеннага сервізаў з дэкорам «Птушкі Ротшыльдаў». Назва звязаная з венскай сям'ёй баронаў Ротшыльдаў, якія ў сярэдзіне XIX ст. заказвалі на мануфактуры сервізы з выявамі 12 розных птушак. Выстаўка прымеркаваная да Нацыянальнага свята Венгрыі – угодкаў рэвалюцыі 1848 года і 185-годдзю мануфактуры.

✓ У Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры **15 сакавіка** прайшло **адкрыццё Другога фестывалю беларускамоўнай рэкламы «AD.NAK!»**. Каардынатар кампаніі Алена Макоўская адзначыла: «Рэкламісты – народ кансерватыўны, таму іх варта пераканаць, што будучыня менавіта за рэкламай на нашай мове». Дарэчы, паводле вынікаў сацыялагічнага апытання 70 % беларусаў хацелі б ведаць пра сваю краіну больш, а 35 % лічаць, што рэкламы па-беларуску не хапае. З гэтага і варта зыходзіць усім зацікаўленым бакам. На імпрэзе быў прадстаўлены буклет з пералікам працаў пераможцаў Першага фестывалю. Прысутныя змаглі таксама яшчэ пабачыць мінулагоднія працы, дасланыя на конкурс, і ўпэўніцца, што беларускамоўная рэклама можа быць яскравай, цікавай, забаўнай, сур'ёзнай, лагоднай, агрэсіўнай, нейтральнай, правакацыйнай.

✓ **17 сакавіка** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры ўжо восьмы раз прайшло **ўручэнне прэміі «Залаты апостраф»** за найлепшую публікацыю ў часопісе «Дзеяслоў» у 2010 годзе. Гэтым разам лаўрэатамі сталі Вінцэсь Мудроў (за прозу), Вольга Гапеева (за паэзію), Настасся Кухарэнка і Франак Вячорка (за лепшы дэбют імя А. Сыса), а таксама Анатоль Вярцінскі – «За высокі творчы ўклад у сучасную беларускую літаратуру». Уганароўвалі лаўрэатаў Алесь Пашкевіч, Эдуард Акулін і Анатоль Івашчанка. Яшчэ адной нагодай для імпрэзы стала святкаванне выхаду 50-га нумара часопіса. Пад час вечарыны з віншаваннямі выступілі Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі, Уладзімір Арлоў, Леанід Дранько-Майсюк, Алесь Усеня. Вёў вечарыну галоўны рэдактар «Дзеяслова» Барыс Пятровіч. Літаратурную частку імпрэзы дапоўніла музычная: гурт «Босае сонца» і бард Юры Несцярэнка выканалі свае старыя і новыя творы.

Наша гісторыя: ідэі, падзеі, імёны

Збіральнік, фалькларыст і бібліёграф

7 лютага Рамуальду Аляксандравічу Зямкевічу споўнілася 130 гадоў з дня нараджэння. Ён увайшоў у гісторыю беларускай культуры як краязнаўца, этнограф, публіцыст, перакладчык, бібліёграф і бібліяфіл.

Нарадзіўся Рамуальд Аляксандравіч у Варшаве. Бацькі былі родам са Случчыны. Вучыўся ў Кіеве на інжынера-механіка, аднак большую частку свайго жыцця правёў у Варшаве. Шмат сілаў і сродкаў аддаваў збіранню матэрыялаў па гісторыі беларускай літаратуры і культуры. Быў злучаны з беларускім нацыянальным рухам.

У яго быў выдатны збор беларускіх, украінскіх, польскіх, літоўскіх старадрукаў. Рарытэтамі яго бібліятэкі з'яўляліся «Біблія» Ф. Скарыны, «Астрожская Біблія», «Лексікон» – слоўнік П. Бярынды, «Хроніка» М. Бельскага, першыя выданні твораў Я. Каханоўскага. Ён сабраў унікальную калекцыю рукапісаў беларускіх пісьменнікаў: А. Рыпінскага, А. Вярыгі-Дарэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Янкі Лучыны, Ф. Багушэвіча, Ядвігіна Ш. (рукапіс драмы «Злодзей»), М. Багдановіча, усе працы Я. Карскага і іншыя. Акрамя таго, ён валодаў аўтографамі ўсіх гэтых пісьменнікаў, а таксама Янкі Купалы, Якуба Коласа, аўтараў газет «Нашай Нівы» і «Нашай долі».

Рамуальд Зямкевіч даследаваў беларускую бібліяграфію, старажытную беларускую народную эстэтыку, фальклор, этнаграфію, мастацтва. Напісаў «Кароткі нарыс беларускай музыкі» (не надрукаваны). Ён апублікаваў невядомыя рукапісы Каруся Каганца, В. Дуніна-Марцінкевіча, Янкі Лучыны і іншых пачынальнікаў нашай літаратуры. Сам напісаў шэраг працаў, з якіх на беларускай мове больш вядомыя пра Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Кіркора, Каруся Каганца, М. Багдановіча. Бібліяграфічныя нарысы даследчыка-шукальніка «Вінцук Дунін-Марцінкевіч, яго жыццё і літаратурнае значэнне» (Наша Ніва, 1910, № 48), «Адам Ганоры Кіркор» і «Ян Баршчэўскі – першы беларускі пісьменнік XIX сталецця» выйшлі асобнымі кнігамі ў 1911 годзе, а праца «Аб беларускай народнай эстэтыцы: спроба характарыстыкі» – у 1927 годзе ў Вільні. Артыкулы і брашуры гісторыка літаратуры ўводзілі ў навуковы ўжытак каштоўны фактычны матэрыял, выхоўвалі ў грамадстве цікаўнасць да архіўна-бібліяграфічных знаходак, спрыялі захаванасці гісторыка-культурных крыніцаў.

Рамуальд Зямкевіч часта карыстаўся псеўданімамі Юры Алелькавіч, Саўка Барывой, Раман Суніца, Шэршань і крыптаграмамі: Р. Зем., Ром. Зем. Р-н Сун., Р. С-ца.

(Заканчэнне на стар. 5)

Нашы віншаванні

«Краязнаўчая газета» шчыра віншуе супрацоўнікаў Калінкавіцкага краязнаўчага музея з 20-годдзем з дня заснавання ўстановы.

Жадаем калектыву музея, усім краязнаўцам раёна новых гістарычных адкрыццяў, змястоўных выставак, цікаўных наведнікаў.



Экспазіцыя музея

Зварот Полацкага зямляцтва і Беларускага фонду культуры

У XII стагоддзі (каля 1159 года) на беразе Палаты ў Полацку была пабудаваная знакамітая Спаская царква Ефрасіннеўскага манастыра –унікальны помнік Полацкай школы дойлідства. Сцены і слупы знутры былі распісаныя непаўторнымі фрэскамі, якія захаваліся да нашых дзён. Мастацтва полацкіх фрэсак нагадвае жывапіс Ноўгарада і Кіева і звязанае з візантыйскай традыцыяй. Але гэта і высокае самабытнае мастацтва Полацкай зямлі.

Зараз фрэскі знаходзяцца на рэстаўрацыі.

Мы звяртаемся да тых, хто жадае ўнесці свой уклад у рэстаўрацыю і захаванне гэтага непаўторнага цуду старажытнарускага насценнага роспісу, пераводзіць свае дабрачынныя ахвяраванні на рахунак Грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд культуры»:

Р/с 3015741330015 в отд. № 539 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», код 739 (на рэстаўрацыю фресок).

Ад Полацкага зямляцтва
Старшыня – пісьменнік і журналіст ***Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ***

Ад імя Беларускага фонду культуры
Старшыня ***Уладзімір ГІЛЕП***

Ахвяраванні працягваюць паступаць. Адгукнуліся яшчэ:
Бутэвіч Анатоль Іванавіч, г. Мінск
Сапранкова Анастасія Мікалаеўна, г. Гомель
Свірыдава Антаніна Антонаўна, г. Полацк

Дзякуем добрым людзям і чакаем новых паступленняў!

Ефрасіннеўскі манастыр
на фота Сяргея Пракудзіна-Горскага (1912 г.)

Да Міжнароднага дня помнікаў!

Раскажыце ўсім пра сваю мясціну!

Чёлета трэці год запар будзе праходзіць «Фэст экскурсаводаў», прымеркаваны да Міжнароднага дня помнікаў і гістарычных мясцінаў, які адзначаецца ва ўсім свеце 18 красавіка. Пастаянныя чытачы «Краязнаўчай газеты» ведаюць, што гэта за мерапрыемства: цягам некалькіх дзён пройдзе шэраг экскурсіяў па гістарычных цэнтрах гарадоў, мястэчкаў, па іншых цікавых ды адметных мясцінах. Усе экскурсіі бясплатныя, а ў ролі экскурсаводаў выступаюць як прафесійныя гіды, краязнаўцы, так і аматары, захопленыя гэтай незвычайнай справай.

Шкада толькі, што арганізатары не маюць магчымасцяў ахапіць як мага больш гарадоў і мястэчкаў Беларусі, каб зрабіць свята маштабным. А галоўнае – прыцягнуць увагу, абудзіць інтарэс да мінуўшчыны, пашану да спадчыны, у якім бы стане яна не знаходзілася. А гэта – вялікае неаранае поле, якое трэба карпатліва абрабляць і нічога не прапусціць. Дык вось, паважанае спадарства, наперад! Надыходзіць, спадзяюся, цёплая вясна. І калі сонейка за вакном прыветліва пакліча на вуліцу, а дрэўцы павітаюць яшчэ клейкімі зялёнымі лісточкамі, прыйдзе і час «Фэсту экскурсаводаў». А каб не застацца ўбаку і зрабіць гэтае свята запамінальным менавіта для сваёй мясцовасці, адкрыць невядомыя старонкі гісторыі і проста нанава пазнаёміць сваіх землякоў з паселішчам, дзе нарадзіліся і жывуць, трэба далучыцца: сабраць звесткі пра свой горад ці мястэчка, вёсачку, сядзібу (ды пра што заўгодна), распрацаваць маршрут. А напярэдадні свята (дзён за пяць) папярэдзіць нас пра ўдзел.

І не бойцеся пачынаць. Толькі ўявіце: можа стацца,

што вы з'яўляецеся носьбітам тых ведаў, пра якія іншыя не здагадваюцца. А тут ёсць магчымасць імі падзяліцца, зрабіць зацікаўленых людзей больш дасведчанымі, адчуць цеплыню асяроддзя – такога роднага, утульнага.

Дадаткова інфармацыю можна атрымаць па тэлефонах 557-11-24 (МТС; Цімох Акудовіч, каардынатар па Мінску) і 277-29-44 (МТС; Наста Кадыгрыб, каардынатар па рэгіёнах). Свае пытанні таксама можаце дасылаць на электронную скрыню pradslava@gmail.com.

Маша МЯДЗВЕДЗЕВА

Выявы Амерыкі

Выявы Амерыкі, што ахопліваюць некалькі стагоддзяў яе гісторыі і культуры, захаваныя на 40 рэпрадукцыях знакавых твораў мастацтва, можна ўбачыць у галерэі «Панарама» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Перасоўная выстаўка, што пабыла ў розных краінах свету, адкрылася ў Мінску дзякуючы сумеснай ініцыятыве Аддзела культурных праграм Бюро па пытаннях адукацыі і культуры Дзяржаўнага дэпартамента ЗША і Фонду «National Endowment for the Humanities». Панарама твораў амерыканскага мастацтва ўключае працы жывапісцаў, скульптараў, фатографаў, архітэктараў і майстроў дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва і ахоплівае перыяд з 1768 г. па 1996 г.

У сваім выступе на адкрыцці загадчык выставачнай дзейнасці бібліятэкі Фёдар Ястраб звярнуў увагу на тое, што за параўнальна кароткі тэрмін гісторыі амерыканскага выяўленчага мастацтва, пачатак якому быў пакладзены еўрапейскімі творцамі (у тым ліку і выхадцамі з Беларусі), ЗША ператварыліся ў сусветны цэнтр сучаснага мастацтва. Нью-Ёрк да гэтага часу застаецца самым буйным цэнтрам артрынку. Толькі ў адным гэтым горадзе дзейнічае тысяча галерэяў, тысяча сусветна вядомых дылераў і працуе сто тысячаў мастакоў. Таму ЗША надаюць такі моцны дынамізм сусветнай культуры.

М. Скенэн

Часовы паверaны ў справах ЗША ў Рэспубліцы Беларусь Майкл Скенэн перадаў у дарунак Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі набор факсімільных рэпрадукцыяў твораў спадчыны выяўленчага мастацтва ЗША і інфармацыйны даведнік для настаўнікаў па яе гісторыі і культуры.

Зм. ВОЖЫК

Асоба ў краязнаўстве

Быццам па суседстве

З нагоды 80-годдзя Аляксея Пяткевіча

Мая перапіска з Аляксеем Міхайлавічам Пяткевічам займае тры тоўстыя папкі, а на маіх паліцах значнае месца займаюць яго кнігі. Вучоны, пісьменнік, краязнаўца, педагог, грамадскі дзеяч з Гродна сваімі развагамі не толькі падштурхоўваў мяне да нейкіх даследаванняў і роздумаў, але тыя развагі развівалі ідэі некаторых маіх кніг. Я люблю перачытваць яго лісты, віншаванні, кнігі, брашуры, выразкі з газет. І адчуваю, што без яго не было б некаторых маіх працаў ды адкрыццяў. Парадокс, але я ніколі не бачыўся з Аляксеем Міхайлавічам; ды мяне не пакідае адчуванне, што жыў і жыву з ім побач, па-суседску хаджу да яго, браў і бяру парады, што ён правіў мае рукапісы.



Аляксей Міхайлавіч нарадзіўся 30 сакавіка 1931 года ў сям'і рабочага ў мястэчку Новы Свержань каля Стаўбцоў, якое ў той час уваходзіла ў склад Польшчы. Мабыць, тады ён назаўсёды ўвабраў, усмактаў разам з малаком маці водар паветра, сокі роднай глебы, гукі Нёмана, каб потым на яго берагах у Гродне стаць яркай асобай.

У нататках «З пройдзенага» Аляксей Пяткевіч успамінае: «У Новым Свержані ў 1938 годзе пайшоў у польскую школу, адразу ў другі клас, бо самастойна навучыўся чытаць і пісаць па-польску, зрэшты, і па-беларуску. Вучыўся затым у беларускай школе пры Саветах, пры немцах, зноў пры Саветах (двойчы адсаджвалі ўвесь клас на адзін год уніз – у 1938–1940 і 1944–1945 гадах). Скончыў Навасвержанскую сямігодку ў 1946 годзе. Лёгка даваліся ў школе мовы, літаратура. Напэўна, таму што настаўнікі-прадметнікі былі з божаю іскраю ў сэрцы – Канстанцін Фёдаравіч Самахвал (беларуская мова і літаратура) і Міхаіл Іванавіч Бутанаў (руская мова і літаратура)».

Пасля заканчэння ў Стоўбцах рускай сярэдняй школы А. Пяткевіч нягледзячы на шалёны конкурс у 1949 годзе паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. На працалюбнага дапытлівага юнака звярнуў увагу выдатны спецыяліст Ю.С. Пшыркоў, які ўзяў кіраванне яго курсавой працай «Характар драматычнага канфлікту ў пасляваенным беларускім рамане», а потым і дыпломнай працай, і ў аспірантуры.

Па згодзе з аднакурснікам А. Пяткевіч змяніў сваё размеркаванне са сталічнага асфальту: *«...у 1957 годзе я трапіў у Гродна. З той пары прайшло, па сутнасці, цэлае жыццё ў горадзе над Нёманам. Я тут не проста прыжыўся. Я стаў гродзенцам, для якога кожная драбніца старых вуліц і вулачак, унікальных помнікаў архітэктуры, старажытных каштанаў і ліпаў значная і дарагая. Тут выраслі ўжо мае ўнукі»*. Што і казаць, потым зямлю, на якой абжыўся, дзе запусціў карэнні, ён уславіў і ўпрыгожыў першым і незвычайным даведнікам «Людзі культуры з Гродзеншчыны». Гэта артыкулы-персаналіі пра вядомых асобаў, якія нарадзіліся на гэтай зямлі. Акрамя гэтага выдання было яшчэ адно краязнаўчае даследаванне – «Літаратурная Гродзеншчына: Мясціны. Людзі. Кнігі», што выйшла ў 2000 годзе.

Якраз у Гродне ён напісаў першую кнігу пра творчыя здабыткі Кузьмы Чорнага (выдадзеная ў 1981 годзе); а яшчэ раней, у 1963-м, абараніў кандыдацкую дысертацыю «Псіхалагічны аналіз і праблема характару ў прозе К. Чорнага». У Гродзенскім педінстытуце, а пасля – універсітэце імя Янкі Купалы, Аляксей Міхайлавіч працаваў на кафедры літаратуры, на кафедры беларускай літаратуры, потым на створанай па яго завадатарстве кафедры беларускай культуры. У 1994 годзе атрымаў званне прафесара.

У Саюз пісьменнікаў СССР А. Пяткевіч быў прыняты ў 1971 годзе як крытык і літаратуразнаўца. Шмат працы і часу ён аддаў і аддае калектыўным зборнікам, асабліва па гісторыі літаратуры да 1917 года.

Кола яго зацікаўленняў неабдымнае, але выдзелю яшчэ два – энцыклапедызм і любоў да гістарычнай краязнаўчай працы. Тут жа хачу адзначыць выданні «Маршруты кніжнага слова: з гісторыі кнігі, друку на Гродзеншчыне» (2002) і «Старонкі спадчыны: Культурнае памежжа Гродзеншчыны: працэсы, з'явы, асобы» (2006). Нельга пакінуць без увагі плённую працу прафесара з выдавецтвам «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» і яго ўдзел у падрыхтоўцы і выданні многіх гістарычных раённых хронік «Памяць», цікавыя публікацыі вучонага ў «Краязнаўчай газеце».

Калі я служыў у Забайкаллі (Бурація), то ад аднаго з месцічаў на імя Цверэн запісаў дасціпнае настаўленне з тыбецкіх казак: «Дзяліце свет не на Поўнач і Поўдзень, не на Захад і Усход, але паўсюль адрознівайце стары свет ад новага». І калі я перачытваю творчыя здабыткі Аляксея Міхайлавіча, то заўсёды ўзгадваю гэтую мудрасць.

Сваё 80-годдзе Аляксей Міхайлавіч сустракае на высокім узлёце, на творчым пад'ёме. Зычым яму працягваць творчы і даследчы працэс, жадаем шчасця, здароўя, моцы, дабрабыту і толькі чыстых і светлых дзён!

Міхась МАЛІНОЎСКІ, г. Баранавічы

Спадчына ў небяспецы

Ці захаваем?

Калі ехаць на аўтамабілі па трасе Стаўбцы–Нясвіж, каля в. Новыя Навасёлкі позірк затрымоўваецца на масіўных руінах пасярод мясцовых могілак. Адчуваецца веліч былой пабудовы, яе старадаўнасць і трагізм. Некалі гэта быў касцёл.

Ён быў пабудаваны ў другой палове XVIII стагоддзя (да 1771 года, дакладныя гады не высветленыя) пад кіраўніцтвам ксяндза Трацкевіча, тагачаснага настаяцеля Нясвіжскай парафіі. Храм быў крыжападобны ў плане, мураваны, арыентаваны на ўсход. Каля 1826 года ксёндз-настаяцель Бужаноўскі разбурыў дзве часткі касцёла, пакінуўшы толькі адну – прыстольную, да якой прырабіў фронтавую сцяну з дзвярыма. Паводле старых вымярэнняў будынак меў 14 аршынаў у даўжыню, 26 – у шырыню і 22 – у вышыню. У склепе знаходзяцца астанкі ксяндза Трацкевіча. Каб падкрэсліць таямнічасць скляпення, ёсць і паданне пра тое, што пад будынкам пачынаўся падземны ход, які злучаў Новыя Навасёлкі з суседняй вёскай Грубаноўшчына.

З 1860 года храм быў закрыты. Яго маёмасць даглядаў вартаўнік з мясцовых сялянаў. Набажэнствы ў касцёле не праводзіліся, ён служыў пахавальняй на агульных для каталіцкай і праваслаўнай канфесіяў могілках. Прыкладна ў гэты час у афіцыйных дакументах касцёл у вёсцы Новыя Навасёлкі згадваецца як капліца.

У 1867 годзе храм перададзены праваслаўнай канфесіі з прычыны значнага павелічэння колькасці сялянаў, якія перайшлі з каталіцтва ў праваслаўе. Адразу паўстае пытанне правядзення рамонтных працаў і пераабсталявання касцёла пад царкву. Згодна са справаздачай нясвіжскага праваслаўнага святара Івана Маскалевіча, за гады безгаспадарання ў касцёле (капліцы) быў значна пашкоджаны дах і часткова сцены, выбітыя вокны. Рамонтныя працы былі праведзеныя за кошт ахвяраванняў мясцовых сялянаў (з кожнай гаспадаркі было сабрана па 50 капеек срэбрам). Іканастас і прадметы, неабходныя для правядзення набажэнстваў (дыскас, лампады, аналой і іншыя), набытыя на сродкі Мінскай епархіі.

Пры польскай уладзе (1919–1939) будынак былога касцёла зноў вернуты католікам Нясвіжскай парафіі. У савецкі час набажэнствы былі спыненыя, памяшканні храма выкарыстоўваліся для сушкі збожжа і лубіна. Быў часткова пашкоджаны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аднак найбольш значныя разбурэнні пацярпеў у 1948–1950-х. Касцёл страціў дах і скляпенні. Спробы кансервацыі і рэстаўрацыі не прымаліся.

На сёння адносна нядрэнна захаваліся франтон, сакрыстыі, апсіда, а ўнутры над вокнамі – рэшткі дэкаратыўнай ляпніны. У абрысе будынка і аздабленні яскрава ўгадваецца стыль барока. У 2007 годзе яму быў нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці II катэгорыі (рэспубліканскага значэння). Звяртаем увагу, што стан помніка з кожным годам усё больш пагаршаецца. Унутраная прастора зарастае хмызняком, які сваім карэннем павольна, але нястрымна разбурае сцены і фундамент. Высокая вільготнасць і перапады тэмператураў спрыяюць разбурэнню цэглы. І, напэўна, толькі могілкі, што знаходзяцца побач з касцёлам, не дапускаюць утварэння ў яго сценах сметніка з бітага шкла і пластыкавых бутэлек – неад'емнага атрыбута безгаспадарання.

У такіх умовах неабходна ў самым бліжэйшым будучым правесці шэраг кансервацыйных працаў з перспектывай далейшай рэстаўрацыі касцёла. Калі гэта не здзейсніць, Беларусь мае шанец папоўніць спіс страчанай спадчыны.

Яўген КАВАЛЁЎ,
студэнт БДУ культуры і мастацтваў

Унікальны архіў

Спаўняецца 70 гадоў з часу стварэння Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў (БДАКФФД). Нядаўна я наведаў гэтую ўстанову, дзе таленавіты яе кіраўнік, дырэктар архіва Віктар Баландзін і яго намеснік – выдатны краязнаўца Алена Грыневіч цікава паведамілі мне аб мінулым і сённяшнім архіва, аб планах на будучыню. Цяжка ўявіць гістарычную прастору мастацтва, літаратуры, культуры, мінулага нашай Радзімы без архіваў Беларусі, у тым ліку і архіва-юбіляра.

Вытокі дзейнасці архіва – з далёкага ўжо ад нас 1941 года: менавіта тады 29 сакавіка была прынятая пастанова Саўнаркама СССР аб стварэнні Цэнтральнага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў (ЦДАКФФД). Аднак паўнавартасную працу архіў пачаў толькі пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У канцы 1943 года былі зацверджаныя структура і штатны расклад архіва, які налічваў 5 чалавек. Першымі супрацоўнікамі створанай установы былі начальнік архіва А. Петрасян, архіварыус Я. Наркевіч, старшы навуковы супрацоўнік Л. Буханава. Свайго памяшкання архіў не меў, і ўвесь комплекс дакументальных матэрыялаў змяшчаўся ў адной шафе. У 1949 годзе ўстанове перадалі ў карыстанне будынак царквы Св. Марыі Магдалены, што месціўся на закрытых Старажоўскіх могілках у Мінску. Унікальныя трафейныя кінастужкі часоў Вялікай Айчыннай вайны і мноства фотадакументаў з нямецкіх трафейных альбомаў былі атрыманыя архівам у пачатку 1950-х гадоў. З кожным годам фонд актыўна папаўняўся, да таго ж будынак царквы не адпавядаў ўмовам захавання каштоўных архіўных матэрыялаў. Таму ў 1970 годзе паўстала пытанне аб пабудове спецыяльнага будынка. Месцам знаходжання яго быў вызначаны Дзяржынск, і ў 1987 годзе архіў пераехаў у 13-павярховы гмах, які жыхары райцэнтра называюць «небаскробам». З мая 1993 года назва архіва набыла новую абрэвіятуру – БДАКФФД – Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў. На сённяшні дзень гэта найбуйная ў краіне архіўная ўстанова, аб існаванні і працы якой ведаюць далёка за межамі. У архіве функцыянуе 8 аддзелаў і 3 лабараторыі, абсталяваныя сучаснай тэхнікай.

Глыбока ўражвае колькасць матэрыялаў у фондзе архіва: на пачатак 2011 года тут налічвалася каля 260 тысячаў адзінак фотадакументаў, амаль 38 тысячаў фонадакументаў і блізу 2 тысячаў відэадакументаў. Усё гэта – бясцэнны скарб нашай Бацькаўшчыны. Вельмі рэдкія фатаграфіі архіва ілюструюць гісторыю Беларусі на працягу больш за сто гадоў. За пасляваенныя гады ў архіў на захоўванне былі прынятыя цікавыя калекцыі фотадакументаў ветэранаў вайны В. Аркашава, А. Багамолава, І. Дуброўскага. А адным з першых, хто заснаваў гэтую добрую традыцыю, быў Герой Савецкага Саюза М. Міхайлашаў. Ёсць тут фотаздымкі і кінакадры, якія адлюстроўваюць прыезд на Беларусь цара Мікалая II, будаўніцтва Маскоўска-Брэсцкай чыгункі, запуск паветранага шара ў Губернатарскім садзе дакастрычніцкага Мінска.

У 1992 годзе прадстаўніца магнацкага роду Радзівілаў Эльжбэта Тамашэўская (Радзівіл), якая жыве за мяжой, падарыла архіву 55 фотаздымкаў князёў Радзівілаў. Захоўваюцца ў фондах таксама цікавыя фонадакументы, на якіх запісаныя галасы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка, П. Машэрава, Кандрата Крапівы, З.Азгура, С. Станюты і многіх іншых вядомых людзей Беларусі. Дакументы архіва распавядаюць аб пасляваенным аднаўленні прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры краіны, шмат дакументаў прысвечана сучаснасці. Навукова-даведачная бібліятэка архіва, у якой больш за 20 гадоў працуе Людміла Бараўцова, налічвае блізу 2 тысячаў кніг, 17 тысячаў нумароў газет і 15 тысячаў – часопісаў.

Галоўнымі крыніцамі камплектавання фондаў з'яўляюцца Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм», Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія, а таксама фанатэкі рэдакцыяў рэспубліканскіх часопісаў і газет. Падтрымлівае архіў і міжнародныя стасункі. Супрацоўнікі гэтай установы ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы дзвюх буйных міжнародных выставак, а з мая 2010 года архіў з'яўляецца членам Еўра-Азіяцкага рэгіянальнага аддзела Міжнароднага Савета архіваў. Аказвае архіў паслугі многім установам, прадпрыемствам, прыватным асобам Беларусі і замежжа. У архіве ідзе няспынны працэс па ўдасканаленні аўтаматызацыі працы і стварэнні электронных інфармацыйна-пошукавых базаў дадзеных на аўдыявізуальныя дакументы.

Усе поспехі ў дзейнасці архіва дасягаюцца шчырай працай дружнага калектыву супрацоўнікаў. Сярод іх нямала тых, якія тут працуюць больш за 20 гадоў: А. Грыневіч, Т. Рахманько, Л. Бараўцова, П. Краўчук, Т. Белавусава, Л. Бародзіч, А. Кот, Г. Салаўёва, І. Лапкоўская і іншыя. Шмат працуе і моладзі. Супрацоўнікі архіва – людзі творчыя. Напрыклад, сваімі мастацкімі народнымі вырабамі вызначаецца Таццяна Драніца, Таццяна Рахманько вядомая ў Беларусі як салістка народнага ансамбля «Суседзі», Рэнат Багаутдзінаў піша вершы, а Максім Мяснікоў вядомы як мастак – яго творы не раз заваёўвалі ўзнагароды на прэстыжных міжнародных выстаўках.

Сямідзесяцігадовы вынік працы Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў дазваляе глядзець у будучыню з аптымізмам, адчуваць рэальную лучнасць мінулага з сучасным.

Са святам вас, паважаныя архівісты, моцнага вам здароўя, творчых поспехаў, шчасця і радасці на кожны дзень!

Лявон ЦЕЛЕШ, г. Дзяржынск

Галоўны архівіст Г. Манчорава

Намеснік дырэктара А. Грыневіч

Сённяшнія супрацоўнікі архіва



Загадчык лабараторыі П. Краўчук



Збіральнік, фалькларыст і бібліёграф

(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.)

Ад 1909 года Р. Зямкевіч друкаваў літаратуразнаўчыя артыкулы і бібліяграфічныя агляды ў «Нашай Ніве» і іншых беларускіх выданнях. «Наша Ніва» на сваіх старонках змяшчала не толькі бягучую інфармацыю пра новыя беларускія кнігі, але ставіла задачу скласці рэтраспектыўны паказальнік усіх беларускіх кніг і літаратуры пра Беларусь, які дазволіў бы больш шырока выкарыстоўваць іх з мэтай народнай асветы. У дадатку да газеты «Наша Ніва» – папулярныя выданні «Беларускі каляндар на 1910 год» надрукаваны рэтраспектыўны паказальнік Рамуальда Зямкевіча «Беларуская бібліяграфія», у якім ён улічвае 100 беларускіх кніг кірылаўскага друку за XVI–XVIII стагоддзі. Пры стварэнні паказальніка Р. Зямкевіч кіраваўся толькі прыметай мовы. У ім знайшлі адлюстраванне кнігі, выдадзеныя не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і за мяжой. Заслуга яго ў гісторыі беларускай бібліяграфіі ў тым, што ён з'яўляецца аўтарам першага спецыялізаванага даведніка на беларускай мове.

Рамуальд Зямкевіч супрацоўнічаў з вядомымі беларусазнаўцамі Я. Карскім, М. Федароўскім і Ч. Пяткевічам (дапамагаў ім сваімі матэрыяламі і звесткамі). Пазней дапамагаў таксама варшаўскаму славісту Ю. Галомбаку ў працы над манаграфіяй пра В. Дуніна-Марцінкевіча. Ён абменьваўся навуковай інфармацыяй з А. Шлюбскім, меў пэўныя стасункі з вядомым пісьменнікам, публіцыстам, краязнаўцам Аляксандрам Ельскім. Захаваўся яго ліст да Ельскага ад 21 сакавіка 1909 года, у якім Зямкевіч выказвае жаданне пазнаёміцца з неапублікаванымі творамі В. Дуніна-Марцінкевіча, якія зберагліся ў А. Ельскага. Ён апублікаваў верш-пасланне «Вінцуку Дуніну-Марцінкевічу, беларускаму паэту» ў тэксце свайго артыкула «Стары Мінск у беларускіх успамінах».

Р. Зямкевіч, Г. Леўчык і З. Верас

Публікатарская дзейнасць Рамуальда Зямкевіча працягвалася ў 1920–1930-я гады ў Заходняй Беларусі. Выйшлі такія яго працы, як «Нацыянальнасць у Вінцука Дуніна-Марцінкевіча: Матэрыялы да характарыстыкі творчасці» (Заходняя Беларусь. Вільня, 1923. Кн.1), апублікаваная пад псеўданімам Суніца Р. і «Ян Неслухоўскі (Янка Лучына) і яго невядомыя творы» (Нёман (Вільня). 1932. Кн. 2). Да ліку першых цікавых арыгінальных працаў па гісторыі беларускай літаратуры можна з поўным правам аднесці артыкул Р. Зямкевіча «Тарас Шаўчэнка і беларусы», дзе расказаў пра стасункі Т. Шаўчэнкі з беларускім гуртком, пра яго знаёмства з беларускай «Энеідай». Літаратуразнавец Г. Кісялёў прыводзіць такую цытату з артыкула ў сваёй працы «Загадка беларускай "Энеіды"»: *«Шаўчэнка пазнаёміўся з усімі гэтымі беларусамі, прасіў іх, каб чыталі яму свае беларускія творы. І асабліва зацікавіўся беларускімі песнямі. Адзін з маладых беларусаў, Рамуальд Падбярэзскі, знаў многа песень, ён прапеў іх Шаўчэнку і, апрача таго, чытаў усе беларускія творы Я. Баршчэўскага і пераклад Манькоўскага ўкраінскай "Энеіды" Катлярэўскага. Шаўчэнку народныя песні спадабаліся; штучныя літаратурныя творы беларускіх пісьменнікаў ён крыху крытыкаваў, кажучы, што ў іх мала народнага элемента. Аб "Энеідзе" Манькоўскага Шаўчэнка заўважыў, што гэты твор найбольш мае беларускага элемента і што дзеля таго ён найбольш цікавы для яго. Пасля гэтага Шаўчэнка заахвочваў беларусаў, каб яны не пакідалі сваёй працы для народа, нягледзячы на цяжкія варункі, не прападзе дарма і сляды гэтай працы застануцца»*. Артыкулам, які з'явіўся ў друку ў 1910 годзе, ён унёс значны ўклад у вывучэнне беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязяў, у станаўленне беларускага параўнальнага літаратуразнаўства.

У 1908 годзе Р. Зямкевіч рабіў фальклорна-этнаграфічныя запісы каля Зембіна на Барысаўшчыне, дзе пасябраваў з пісьменнікам-нашаніўцам Я. Шпэтам.

У 1913 годзе ён жыў у маёнтку Борхаў каля Рэчыцы Мінскай губерні. У 1913–1914 гадах у пошуках гісторыка-культурных матэрыялаў аб'ехаў многія мясціны Магілёўшчыны. У 1915–1919 гадах жыў у Мінску, працаваў вайсковым інжынерам, удзельнічаў у з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацыяў. Працягваў збіраць унікальную бібліятэку па гісторыі, літаратуры, мовазнаўстве, вусна-паэтычнай творчасці Беларусі, Літвы, Украіны, славянства наогул. Ён сабраў вялікую калекцыю беларускага адзення, густа вышыванага, арнаментаванага. Але яна, па словах Змітрака Бядулі, у 1918 годзе была звезеная немцамі ў Берлін. Збіральніцтвам займалася і яго жонка, журналістка і мастачка Л. Дунін-Баркоўская (1882–1919).

Як краязнаўца Р. Зямкевіч апісваў Крошын, Мінск. Артыкул «Стары Мінск у беларускіх успамінах» апублікаваны ў зборніку Генадзя Кісялёва «Пачынальнікі» (Мінск, 2003).

Упершыню ў 1919 годзе ў часопісе «Беларускае жыццё» (№ 5) Р. Зямкевіч надрукаваў гравіраваны партрэт В. Цяпінскага 1576 года, адшуканы ў бібліятэцы Канстанціна Святаполк-Завадскага ў Крошыне. Нядаўна ў матэрыялах Беларускага музея ў Вільнюсе знойдзеная копія нотаў, зробленая Р. Зямкевічам у той бібліятэцы напярэдадні Першай сусветнай вайны. Лічылася, што гэтыя мелодыі страчаныя назаўсёды, але зараз адшукаліся.

У 1942–1943 гадах пад псеўданімам Шэршань друкаваў сатырычныя вершы ў беластоцкай газеце «Новая дарога». Вядомыя вершы Р. Зямкевіча на польскай мове, а таксама некалькі зробленых ім перакладаў з украінскай і французскай моваў на беларускую.

У гады Другой сусветнай вайны Рамуальд Зямкевіч трапіў пры нявысветленых абставінах у гестапа і загінуў, паводле некаторых звестак, у канцлагеры Асвенцым. Загінула ў разбуранай Варшаве і большая частка яго багатых збораў, унікальная калекцыя рукапісаў з гісторыі беларускага пісьменства. Зборы загінулі, але засталіся шматлікія публікацыі ў часопісах і газетах з паметкай «З архіва Р. Зямкевіча», да якіх тэкстолагі ставяцца з пэўным даверам.

Асобныя рукапісы і лісты, а таксама пераклад апавяданняў А. Дадэ і В. Стафаніка знаходзяцца ў архівах і бібліятэках Мінска, Вільнюса, Варшавы, Санкт-Пецярбурга і інш.

Валянціна СОПІКАВА

Ул. Стальмашонак. «Наша Ніва». Супрацоўнікі газеты. Да 100-годдзя заснавання (1 злева ў 1-м шэрагу – Р. Зямкевіч)

«Беларуская літаратура значыць многае...»

11 сакавіка ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна адбылася цырымонія ўганаравання лаўрэатаў міжнароднага літаратурнага конкурсу «Свет без вайны і насілля». Адным з яго лаўрэатаў стаў метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя М. Багдановіча, выдавец і ўкладальнік некалькіх літаратурных зборнікаў Барыс Брацук.

Гэты конкурс праводзіцца ўжо 20 гадоў, і ладзяць яго мясцовае аддзяленне культуры ў Кжэшыцах (Рэспубліка Польшча), Культурны цэнтр Расіі ў Варшаве, Культурны цэнтр у Мінску і арганізацыя «Фабрыка культуры» з нямецкага горада Фюрстэнвальдэ. Беларусь удзельнічае ў праекце 6 гадоў. Уручаць узнагароды ў нашую краіну прыехалі старшыня конкурсу, старшыня Суленцкага павета (што знаходзіцца на захадзе Польшчы) Браніслаў Крых і стараста раёна г. Суленцын Станіслаў Кубэк.

Найбольш частыя тэмы працаў конкурсу (і празаічных, і вершаваных) – трагедыя чалавека ў сучасным камерцыялізаваным грамадстве, наркаманія, алкагалізм, расавы і рэлігійны пераслед. Вялікую каштоўнасць маюць працы, якія распавядаюць пра агульныя культурныя ці гістарычныя здабыткі краінаў – удзельніцаў конкурсу. Вось чаму тэма Вацлава Ластоўскага, якую ўзняў Барыс Брацук, і не засталася па-за ўвагай міжнароднага журы.

Арганізатары конкурсу, лаўрэаты з Міншчыны і ганаровыя госці: Т. Стружэцкі (другі злева), С. Кубэк (у цэнтры), Б. Крых (трэці справа), Б. Брацук (другі справа)

Ва ўступным слове перад удзельнікамі цырымоніі ўганаравання намеснік Міністра культуры Рэспублікі Беларусь Тадэвуш Стружэцкі адзначыў важнасць падобных праектаў дзеля яднання, параднення людзей і душаў. І яшчэ тое, што дзякуючы конкурсу ўсталёўваюцца добрыя, сяброўскія адносіны паміж народамі і рэгіёнамі розных краінаў.

Як распавядае Б. Брацук, пра конкурс ён даведаўся з інфармацыйнага ліста, які прыйшоў на адрас Маладзечанскай цэнтральнй бібліятэкі. Вельмі спадабалася тое, што працы на разгляд міжнароднага журы можна было дасылаць на беларускай мове. Тэма ж, што была ўзнятая ў ягонай конкурснай працы, – лёсы слынных дзеячаў Беларушчыны ў 30-х гадах мінулага стагоддзя, а называлася «Вяртанне Вацлава Ластоўскага». Праца спачатку была агучаная на адмысловай канферэнцыі ў Беларусі, затым дапоўненая і адпраўленая на конкурс у Польшчу. Б. Брацук і надалей збіраецца ўдзельнічаць у гэтым міжнародным літаратурным праекце.

Адказваючы на пытанне карэспандэнта, старшыня конкурсу Браніслаў Крых адзначыў:

– Ніхто – ні пісьменнікі з Расіі, ні з Польшчы, ні з Германіі не пішуць так прыгожа, як аўтары з Беларусі. Увогуле, беларуская літаратура значыць многае. Я пастараюся зрабіць так, каб выйшла кніжка пісьменнікаў з Беларусі, а таксама з Польшчы, Германіі і Расіі.

На імпрэзе быў адзначаны таксама аўтар гэтых радкоў, які шэрагам публікацыяў садзейнічаў умацаванню сяброўскіх адносінаў паміж Польшчай і Беларуссю.

І Барыс Брацук, і я з'яўляемся таксама ўдзельнікамі праекта мясцовага дабрачыннага фонду «Паўночныя Афіны» па захаванні і папулярызацыі спадчыны М.К. Агінскага і яго сям'і, таму пад час гутаркі пасля ўручэння прызоў і ўзнагародаў Б. Крых падтрымаў ідэю супрацоўніцтва паміж літаратарамі Беларусі і Польшчы ў галіне правядзення сумесных літаратурных і краязнаўчых акцыяў па тэме Міхала Клеафаса Агінскага, а таксама выказаўся за ўстанаўленне больш цесных стасункаў паміж Суленцкім паветам і Маладзечна, а таксама фондам «Паўночныя Афіны».

Алег БЯГАНСКІ,
фота аўтара

Выданні краязнаўцаў краіны

На мапе такое маленькае...

Шмат у нашай Беларусі цікавых і таямнічых мясцінаў. Адна з іх – Астрамечава. Невялічкае мястэчка некалькі стагоддзяў таму сціпла размясцілася ў Брэсцкім павеце (цяпер тэрыторыя Брэсцкай вобласці) недалёка ад мяжы з Польшчай. Багацце гісторыі, прыгажосць роднай старонкі, гонар за знакамітых ураджэнцаў натхнілі краязнаўца з Брэстчыны, даўняга падпісчыка і аўтара нашай газеты Івана Панасюка на напісанне кнігі, якая атрымала назву «Остромечево и "остромычивци"». Яна выйшла летась у брэсцкім выдавецтве "Альтернатива" пры падтрымцы кіраўніцтва СВК «Астрамечава». Як бачым, ёсць месцы, дзе разумеюць важнасць патрыятычнага выхавання праз даследаванне і вывучэнне мінуўшчыны свайго рэгіёну, дзе падтрымліваюць такіх даследчыкаў, у тым ліку матэрыяльна. А яшчэ з кнігай можна пазнаёміцца і ў інтэрнэце, на спецыяльна для гэтага створаным сайце.

Цікава было вандраваць па старонках выдання, трапляючы за некалькі хвілінаў то ў адно, то ў іншае стагоддзе, знаёміцца з міфамі і фактамі і нарэшце апынуцца ў нашых днях. Іван Панасюк зрабіў вялікую працу па збіранні звестак пра свой родны куточак. На прыкладзе адной вёсачкі ў яго атрымалася прасачыць гісторыю фармавання тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак, куды ў свой час уваходзіла Астрамечава. А які незвычайны і адначасова цяжкавымаўляльны (з непрывычкі) дыялект мясцовасці! Хочаш не хочаш, але нават паспрабуеш пра сябе праспяваць некалькі песень. Прыкладам, тую, што распавядае аб прыездзе маладой у дом жаніха:

...Шчоб умила шыты,
прясты
И в свыкрухы вкрасты.
Бо свыкруха – така власть,
Як ны вкрадыш –
то ны дасть.

А вось вам калыханачка:

Ходыть сон по долыны,
Клычэ маты до дытыны:
«Ходы, сонку, в колысоньку,
Прысны нашу дытыноньку».

Альбо возьмеш на ўвагу некалькі прыказак: «Закон як дышло, куды повырнулы, так и выйшло»; «Ны мила баба клопоту, купыла порося».

Спакон веку ў вёсачцы бурліла жыццё: там жылі і цяпер жывуць простыя, адкрытыя, працавітыя людзі, пра якіх і распавядае аўтар. Са старонак кнігі І. Панасюк спрабуе данесці да землякоў-сучаснікаў, і не толькі, звесткі пра іх продкаў, якія адлюстроўваюцца ва ўспамінах і іншых крыніцах. Не абмінае ён і духоўна-асветніцкі бок жыцця астрамечаўцаў. Знаёміць з гісторыяй стварэння і дзеяння бібліятэкі, акая трасфармавалася са звычайнай хаты-чытальні ў сапраўдную скарбонку ведаў. Сёння бібліятэка носіць імя Фларэнція Фёдаравіча Паўленкава, рускага кнігавыдаўца, які ў свой час выдаткаваў сродкі на стварэнне бібліятэк. Распавядае пра з'яўленне Свята-Міхайлаўскай царквы, якое хаваецца за міфічнымі непаразуменнямі. Не абмінуў і трагічны бок біяграфіі вёскі – Вялікую Айчынную вайну.

На апошніх жа старонках кнігі затрымайцеся, каб добра разгледзець каляровыя фотаздымкі сучаснага Астрамечава. Калі чытала пра станоўчыя моманты развіцця і выдатныя вынікі, мне быццам бы перадалося аўтарскае пачуццё гонару за людзей, якія жывуць і працуюць у яго родным куточку.

На мой погляд, гэтая кніга ёсць сапраўдны скарб духоўнай спадчыны невялікай вёсачкі, такой маленькай на мапе, але вялікай у памяці і сэрцах яе жыхароў. Праведзенай татальна-вялікай працаю павінен ганарыцца не толькі аўтар, але і жыхары вёскі: яны сёння ўжо дакладна не згубяцца ў такім аднолькавым грамадстве, якое амаль забылася на сваю адметнасць.

Наста КАДЫГРЫБ

Падару чалавецтву музей!

У станіцы Батурынская Краснадарскага края жыве этнограф і калекцыянер, які сабраў унікальны збор газет з усяго свету.

З Сяргеем Міхайлавічам Дзямідавым мы пазнаёміліся некалькі гадоў таму. Мо нават дзясяць ці болей. Ён – цюрколаг, этнограф; доўга жыў у Туркменіі, а пасля развалу Савецкага Саюза апынуўся ў Краснадарскім краі.

Нарадзіўся С.М. Дзямідаў у Маскве ў 1937 годзе. У 1959-м закончыў гістарычны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1959–1998 гадах – супрацоўнік аддзела этнаграфіі Інстытута гісторыі Акадэміі навук Туркменістана. Аўтар 350-ці навуковых працаў, надрукаваных на рускай, туркменскай, нямецкай і англійскай мовах, у тым ліку – і сямі манаграфіяў. Ён і зараз актыўна працуе як даследчык, вучоны і публіцыст. Жыве ў станіцы і не кожны год выбіраецца ў вялікія гарады да бібліятэк, архіваў, музеяў. Затое ў Дзямідава ёсць унікальная бібліятэка (каля 20 тысячаў тамоў), вялікі архіў. І яшчэ – калекцыя газет.

Менавіта пра гэты збор газетаў Сяргея Дзямідава хацелася расказаць больш падрабязна. Калекцыянаваць перыёдыку этнограф пачаў яшчэ ў другой палове 1950-х гадоў, калі вучыўся ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце. Ён з юнацтва цікавіўся рознымі мовамі.

«Акрамя роднай рускай я, дзякуючы школе, вывучыў украінскую мову. Да ўніверсітэта шэсць гадоў вучыўся ва ўкраінскай школе ў невялікім раённым мястэчку Ярмолінцы на Хмяльнішчыне. Пасля першага курса ўніверсітэта з'ездзіў да дзядзькі ва Узбекістан і зацікавіўся ўзбекскай. Прывёз у Маскву школьны падручнік па ўзбекскай мове. Ва ўніверсітэце ў якасці замежных вывучалі англійскую, нямецкую, стараславянскую, лацінскую мовы. А пазней, факультатыўна, я штудзіраваў персідскую і урду. На трэцім курсе ўпершыню патрапіў з экспедыцыяй кафедры этнаграфіі ў Туркменістан, які мяне проста ўразіў самабытнасцю карэннага насельніцтва. І канешне, не мог не зацікавіцца туркменскай мовай. Вывучаючы розныя мовы, я звяртаўся не толькі да падручнікаў, але і да перыядычных выданняў. Часта заглядваў у кнігарню "Дружба", што месцілася ў будынку Маскоўскага гарсавета. Адтуль мае першыя газетныя калекцыйныя набыткі».

У «Дружбе» Сяргей набываў газеты краінаў народнай дэмакратыі і на невядомых яму мовах. Вабіла сама газета. А следам захацелася ведаць, а што ж там напісана, што прыносяць чытачу паперы і фарбы. Так Сяргей захапіўся польскай, чэшскай, славацкай, сербахарвацкай мовамі. Паспрабаваў вучыць яшчэ тры – мангольскую, венгерскую і кітайскую. І гэта яшчэ не ўсё. Закончыўшы ўніверсітэт, этнограф зацікавіўся турэцкай мовай. Некаторы час займаўся іспанскай і італьянскай. Працуючы ў аддзеле этнаграфіі АН Туркменістана, прайшоў курсы французскай мовы, звярнуўся да падручнікаў грузінскай і армянскай. Спрабаваў пазнаёміцца з іншымі.

«Газеты на іншых мовах, – расказвае Сяргей Міхайлавіч, – *адкрывалі мне невядомыя дагэтуль звесткі па этнаграфіі, культуры іншых народаў. Так я мэтанакіравана збіраў узоры перыёдыкі з савецкіх рэспублік і краінаў сацыялістычнага лагера. Цэны ў 1970–1980-я гады былі даступныя. Калі маштабы калекцыі пачалі набываць істотныя абрысы, я пісаў лісты ў розныя рэдакцыі, прасіў дапамагчы набыць экзэмпляры выдання. Першнаперш звяртаўся ў выданні, якія нечым вылучаліся. Так да мяне прыйшла адзіная ў Савецкім Саюзе газета на карэйскай мове "Ленин Кичи" ("Ленінскі шлях"). Выпісаў яе на адзін месяц. А ў рэдакцыі так здзівіліся, што дасылалі мне яе з Карагандзінскай вобласці на працягу ўсяго 1973 года. Дарэчы, у звязку з гэтым згадваецца такая гісторыя. У гэтым жа годзе мне давялося з двума таварышамі пабываць у цяжкадаступнай пячоры Дзева на гары Душак за 40 км ад Ашхабада. Шматок гэтай газеты, якую мы выкарыстоўвалі для распальвання вогнішча, застаўся ў пячоры. Праз некалькі дзён туды зазірнулі салдаты з воінскай часці, што была паблізу. Знайшоўшы газету на невядомай мове, паведамілі пагранічнікам. Была аб'яўленая баявая трывога. Пачалі прачэсваць мясцовасць. Як спецыяліста-спелеолага да пошукаў падключылі і аднаго з маіх спадарожнікаў. Ён і патлумачыў усю камічнасць сітуацыі».*

> *– Газеты на іншых мовах, – расказвае Сяргей Міхайлавіч, – адкрывалі мне невядомыя дагэтуль звесткі па этнаграфіі, культуры іншых народаў*

З цягам часу пра захапленне С.М. Дзямідава ведалі многія яго сябры, знаёмыя і з паездак прывозілі яму газеты іншых рэспублік. Атрымалася, як у туркменскай прыказцы: «Кропля па кроплі – будзе возера». Асаблівую каштоўнасць уяўляюць нумары першыя і апошнія. Ёсць выданні на дзвюх мовах. А таксама сумесныя выданні некалькіх рэдакцыяў. Рарытэтным з'яўляецца экзэмпляр, дзе на адным аркушы аб'яднаныя дзве газеты зусім розных народаў: на адным баку «Дэмакратычны Азербайджан», а на другім – «Дэмакратычны Курдыстан». Газета выйшла ў 1946 годзе ў Іране. Праўда, гэтыя вобласці, якія абвясцілі сваю незалежнасць на хвалі моцнага пасляваеннага нацыянальнага ўздыму, як і іх выданні, праіснавалі нядоўга. Ёсць выданні, кожны нумар якіх выходзіў накладам 300, а то і ўсяго 138 экзэмпляраў. Гэта датычыцца газет мансі, хантаў і чукчаў. У калекцыі ёсць газеты Турцыі, Ірана, Афганістана, Індыі, Кітая, Манголіі і іншых краінаў Азіі. Таксама выданні амерыканскага і афрыканскага кантынентаў.

– Ці ёсць у вашай калекцыі беларускія газеты? – пытаюся ў Сяргея Міхайлавіча.

– Маю ўсе рэспубліканскія грамадска-палітычныя газеты з 1970–1990-х гадоў. Ёсць і некаторыя раённыя і абласныя газеты. Маю «Звязду», «Советскую Белоруссию» за розныя гады. У канцы 1980-х – пачатку 1990-х я выпісваў больш за дзесяць беларускіх газетаў адначасова. Шмат што па-беларуску атрымліваў дзякуючы паездкам знаёмых у Мінск і іншыя гарады Беларусі. Некаторыя выданні прывозіў з Масквы, дзе ля станцыі метро «Плошча Рэвалюцыі» быў кіёск з перыёдыкай саюзных рэспублік. Але хацелася б мець беларускія газеты на іншых мовах – польскай, літоўскай, татарскай... Няма ў мяне і беларускай царкоўнай перыёдыкі.

Дарэчы, пра падпіску. У 1991 годзе Сяргей Міхайлавіч за ўласны кошт выпісваў 186 савецкіх і замежных газетаў і часопісаў. Выпадак, па савецкіх часах, унікальны. Сапраўды, такога падпісчыка можна было б заносіць у «Кнігу рэкордаў Гінэса». Зараз, па зразумелых прычынах дарагавізны, краснадарскі этнограф атрымлівае па падпісцы болей за дзесяць расійскіх выданняў. Шматкроць скараціўся і ручаёк паступленняў у газетную калекцыю.

Збіральніка паштовых марак называюць філатэлістам, значкоў – фанерыстам, старых паштовак – фінакартыстам. Сябе ж як калекцыянера перыёдыкі Сяргей Міхайлавіч называе прэсафілам. Тысячы газетаў захоўваюцца ў пэўнай сістэме, раскладзеныя па каробках. На сядзібе Дзямідавых у станіцы Батурынская калекцыі адведзены асобны невялікі цагляны будынак. Уваход упрыгожвае шыльда з надпісам «Прэса».

> *Дарэчы, пра падпіску. У 1991 годзе Сяргей Міхайлавіч за ўласны кошт выпісваў 186 савецкіх і замежных газетаў і часопісаў. Выпадак, па савецкіх часах, унікальны. Сапраўды, такога падпісчыка можна было б заносіць у «Кнігу рэкордаў Гінэса»*

– Калі знойдзецца адпаведная ўстанова, – дзеліцца сваім клопатам калекцыянер, – *ці нават прыватны спонсар, гатовыя стварыць музей прэсы, то я перадам збор без усялякае аплаты. Галоўнае, каб захавалася цэласнасць калекцыі.*

Мікола МІРШЧЫНА

У тэатры «Зьніч»

6 красавіка для маленькіх гледачоў паэтычны тэатр аднаго акцёра «Зьніч» падрыхтаваў лялечны монаспектакль Л. Мікіты **«Пра ката Сафрона і пеўніка Андрона»** ў выкананні Леаніда Сідарэвіча.

11 красавіка гледачоў сустрэне казачная гісторыя пра прыгоды двух паноў, якія нічога не рабілі, толькі елі, пілі і біліся паміж сабой, – **«Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага»**. Аўтары Пятро Васючэнка і Сяргей Кавалёў, лялькамі гуляе Вячаслаў Шакалідо.

Увечары таго ж дня гледачы змогуць пазнаёміцца з паэтычным монаспектаклем **«Красёнцы жыцця»**, створаным паводле паэмы Якуба Коласа «Новая зямля». Галоўны герой Міхал нарадзіўся, вырас і жыў на зямлі, якую не проста разумеў і любіў – якой дыхаў, з якой зрадніўся, якую б жадаў назваць сваёй. Але няўмольны лёс наканаваў іншае... Выканаўца Алесь Кашпераў.

13 сакавіка закружыць **«Вясёлая каруселя»** – монаспектакль-сустрэча паводле твораў Артура Вольскага ў выкананні заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Ларысы Горцавай пры музычным суправаджэнні Дар'і Неўмяржыцкай (цымбалы).

14 красавіка мона-спектаклем **«Мой Маленькі прынц»** артыстка Раіса Астрадзінава дасць адказ на пытанне «Дзеля чаго свецяць зоркі?». Спектакль створаны паводле твора А. дэ Сэнт-Экзюперы і вершаў Беранжэ ў перакладзе Ніны Мацяш і прысвечаны памяці народнага артыста СССР Яўгена Глебава.

«Штодзённымі клопатамі поўніцца жыццё людское. Але калі зварухнецца душа чалавека – толькі песня здолее спасці яе» – **14 красавіка** музычна-паэтычным спектаклем **«У краіне светлай...»** па творах Максіма Багдановіча. Выканаўца Вячаслаў Статкевіч, музычнае суправаджэнне Сяргея Сарокіна (гітара).

Спектаклі адбываюцца ў Тэатральнай зале культурнага цэнтра касцёла Св. Сымона і Св. Алены ў Мінску. Дзіцячыя пастаноўкі пачынаюцца а 15 гадзіне, вечаровыя – а 19-й. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэлефоне (017) 331-75-53.

Красавік

1 – Балота Мох, гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння (Мёрскі р-н; 1981) – 30 гадоў з часу заснавання.

1 – Літаратурны музей Максіма Багдановіча, дзяржаўная ўстанова (Мінск; 1981) – 30 гадоў з часу заснавання (адкрыты 08.12.1991).

4 – Шчаглоў-Куліковіч Мікола (1896–1969), кампазітар, жыў у ЗША – 115 гадоў з дня нараджэння.

5 – Май Рышард Антонавіч (1936, Клецкі р-н), мастак, працы якога знаходзяцца ў дзяржаўных музеях і прыватных калекцыях Беларусі, ЗША, Германіі, Польшчы і інш. краінаў, заснавальнік і кіраўнік дзіцячай мастацкай студыі Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі ў Мінску, выхавальнікі якой з'яўляюцца шматкратнымі дыпламантамі і прызёрамі міжнародных конкурсаў дзіцячай творчасці – 75 гадоў з дня нараджэння.

6 – Шупенька Генадзь Серафімавіч (1936, Мядзельскі р-н – 2010), крытык і літаратуразнаўца, які ўнёс значны ўклад у прапаганду беларускай літаратуры – 75 гадоў з дня нараджэння.

7 – Свянціцкі (Свяціцкі) Іларыён Сямёнавіч (1876, г. Буск Львоўскай вобл. – 1956), украінскі філолаг-славіст, даследчык беларускай культуры, супрацоўнічаў з газетай «Наша Ніва», удзельнічаў у працы Інбелкульта – 135 гадоў з дня нараджэння.

7 – Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі – 85 гадоў з часу стварэння.

10 – Чыгрын Іван Пятровіч (1931, Слонімскі р-н – 2006), літаратуразнаўца, крытык, паэт, даследчык беларускай прозы і фальклору, аўтар манаграфіяў і шматлікіх навуковых артыкулаў – 80 гадоў з дня нараджэння.

12 – Пацей Іпаці (свецкае імя Адам Львовіч; 1541, Камянецкі павет – 1613), царкоўны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ, пісьменнік-палеміст, адзін з ініцыятараў і арганізатараў Брэсцкай уніі 1596 г. – 470 гадоў з дня нараджэння.

13 – Мінска-Магілёўская архідыяцэзія, царкоўна-адміністрацыйная адзінка Каталіцкай Царквы на Беларусі (1991) – 20 гадоў з часу стварэння.

14 – «Минский листок», першая на Беларусі легальная грамадска-палітычная і літаратурная газета ліберальнаасветніцкага кірунку, у якой упершыню (1889) была апублікаваная ананімная паэма «Тарас на Парнасе» (Мінск; 1886–1902) – 125 гадоў з пачатку выдання.

Правілы паводзінаў пад час паводкі

Калі вашая хата апынулася ў зоне магчымага затаплення, вам трэба адключыць газ, ваду і электрычнасць, патушыць агонь у печцы, перанесці на верхнія паверхі ці гарышча каштоўныя рэчы, прадукты харчавання. Пры неабходнасці зачыніце вокны і дзверы, на першым паверсе забіце іх дошкамі ці фанерай.

Існуе праверaны спосаб не пусціць ваду на ганак: выкапаць каля дома канаўкі, куды будзе сцякаць вада. Пад час паводкі і цягам двух-трох тыдняў пасля адыходжання вады не піце з калодзежа, бо там могуць знаходзіцца хваробатворныя мікробы.

Калі вы атрымалі папярэджанне аб эвакуацыі, падрыхтуйцеся: не забудзьцеся на цёплую вопратку, боты, коўдры, грошы і каштоўнасці. Неабходны і трохдзённы запас харчавання, аптэчка першай дапамогі і лекі; загарніце ў непрамакальны пакунак пашпарт і іншыя дакументы. Збярыце неабходныя сродкі гігіены і пасцельную бялізну.

Пры рэзкім пад'ёме вады перайдзіце ў бяспечнае месца і падрыхтуйцеся да магчымай самаэвакуацыі, для чаго акрамя лодак, плытоў і надзіманых матрацаў можна выкарыстаць бочкі, бярвенне, шчыты, дзверы, аўтамабільныя камеры.

Да прыезду выратавальнікаў і адыходжання вады заставайцеся на верхніх паверхах і дахах, дрэвах ці іншых узвышшах. Памятайце: выратавальнікам будзе прасцей знайсці тых, хто пацярпеў, пры ўмове, што ў светлы час сутак на высокае месца будуць вывешаныя белае ці каляровае палатно, а ў цемры будуць падавацца светавыя сігналы.

У першую чаргу выратоўваюць жанчынаў і дзяцей. Ад вас у гэты час патрабуецца толькі дакладна выконваць патрабаванні выратавальнікаў, пераходзіць ў лодку па адным, не ствараючы панікі.

Самастойна выбірайцеся з затопленых раёнаў толькі ў безвыходных сітуацыях, напрыклад, калі камусьці патрэбная тэрміновая дапамога.

Вольга ЦЫНКЕВІЧ,
інспектар ЦРАНС
г. Мінска

Фота Алеся САЧАНКІ

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

Пачатак у № 1 за 2003 год)

Лацінская літаратура Беларусі – творы беларускай літаратуры, напісаныя на лацінскай мове ў XIV–XVIII стст. Узнікла ў выніку цесных сувязяў Беларусі з заходнееўрапейскімі краінамі, пранікнення каталіцызму і зацвярджэння латыні як мовы культавага прызначэння і рэлігійнай літаратуры, асветы і навукі, справаводства і інш.

Выданне «Лірычных вершаў» Мацея Сарбеўскага (1625 г.)

Паводле характару мовы, на якой у Беларусі стваралася лацінская літаратура, вылучаюць сярэдневяковы перыяд (XIV–XV стст., вульгарная латынь) і новалацінскі (XVI–XVIII стст., класічная латынь). Яе фармаванне ва ўсходніх славянаў і літоўцаў пачалося пазней, чым у краінах Заходняй Еўропы. Новалацінская сістэма адукацыі (разам з грэка-візантыйскай) і літаратура зрабілі істотны ўплыў на фармаванне ўсходнееўрапейскіх культураў эпох Адраджэння, Асветніцтва і сталі іх неад'емнай часткай. Першыя рэнесансавыя і барочныя ўплывы пранікілі на беларускія землі ў «лацінскім адзенні».

У новалацінскай літаратуры ў нас інтэнсіўна развіваліся розныя жанры: паэзія, проза, драматургія, вучэбная і філасофская літаратура, паэтыка, рыторыка. Яе найбуйнейшыя прадстаўнікі XVI–XVIII стст. – Я. Вісліцкі, М. Гусоўскі, М. Літвін, С. Будны, А. Волан, К. Нарбут, П. Раізій, Ф. Градоўскі, Э. Пельгжымоўскі, Э. Капіевіч, А. Доўгірд, С. Рысінскі, Сімяон Полацкі, М.К. Сарбеўскі. М. Карыцкі і інш. У XVI–XVII стст. на землях Беларусі значная частка кніг выходзіла і бытавала на лацінскай мове. Развіццё лацінскай літаратуры адкрыла беларусам шлях да спасціжэння антычнай спадчыны і дало магчымасць самім удзельнічаць у агульнаеўрапейскім літаратурным руху, абмене духоўнымі каштоўнасцямі паміж Усходам і Захадам. Лацінская культура была школай стылістыкі для беларускай літаратуры, адной з крыніцаў узбагачэння літаратурнай мовы.

Лацінская мова, латынь, лаціна – адна з старажытных інда-еўрапейскіх моваў. Адносіцца да італійскай групы. Мёртвая. Алфавіт лацінскі. Афіцыйная мова Ватыкана і каталіцкай царквы. Выкарыстоўваецца ў навуковай тэрміналогіі. Вывучаецца ў некаторых ВНУ Беларусі.

З паходжання – мова племені лацінаў, якія насялялі вобласць Лацый у заходняй частцы сярэдняй Італіі з цэнтрам у Рыме. Пісьмовыя помнікі з VI ст. да н.э. Найбольшага развіцця літаратурная лацінская мова дасягнула ў перыяд «залатой латыні», калі былі напісаныя творы Цэзара, Цыцэрона, Вергілія, Гарацыя, Авідзія. «Позняя латынь» характарызуецца развіццём народна-размоўнай мовы. Пасля гібелі Заходне-Рымскай імперыі (V ст. н.э.) з дыялектаў пачалі развівацца раманскія мовы. Зрабіўшыся дзяржаўнаю моваю многіх краінаў Еўропы, у сярэднія вякі стала міжнароднай мовай навукі, школы, філасофіі, дыпламатыі, часткова літаратуры.

У XVI–XVIII стст. на ўсходнеславянскіх землях, у т.л. і на тэрыторыі Беларусі, лацінская мова выкладалася ў навучальных установах, выкарыстоўвалася ў справаводстве, дыпламатычнай перапісцы, пры напісанні навуковых трактатаў і літаратурных твораў. Яе добра ведалі і на ёй пісалі беларускія асветнікі М. Гусоўскі, С. Будны, Сімяон Полацкі і інш. Многія запазычанні з лаціны ўвайшлі ў беларускую мову. У XVI–XVIII стст. значна папоўнілася грамадска-палітычная, юрыдычная, канцылярская (депутатъ, статутъ, документъ, канцелярия, консультация, мандатъ, миссия, персона, процессъ, секретарь, юрисдикция), сацыяльна-эканамічная (аренда, экономия, кооперация, сума, такса) лексіка. Атрымала новыя сродкі выражэння тэрміналогія навукі, літаратуры, мастацтва (вершъ, авторъ, колеръ, лекторъ, музыка, нота, студентъ, текстъ). Многія старыя лацінізмы захаваліся да нашых дзён. У мінулым стагоддзі крыніцай лацінізмаў для беларускай мовы стала руская, з якой пераважна запазычваюцца інтэрнацыяналізмы – у асноўным грамадска-палітычныя і навукова-тэхнічныя тэрміны (анексія, апазіцыя, інфляцыя, дактрына, рэвалюцыя, амплітуда, дэфармацыя, лабараторыя, эвалюцыя і інш.).

Фрагмент карты ВКЛ; гравёр Т. Макоўскі (1613 г.) з назваю нашай дзяржавы

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г.
Заснавальнікі:
грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае унітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віталь Скалабан, Віктар Хурсік.

Наш адрас:
220029, г. Мінск,
вул. Траецкая набярэжная, 6.
Тэл. 283 28 26,
334 61 62.
Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 24.03.2011.
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.

Заказ 318.
Тыраж 1180 асобнікаў.